Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

DOI:10.17951/sb.2017.11.181
Studia Białorutenistyczne 11/2017 Literaturoznawstwo

Сяргей Кавалёў / Siergiej Kowalow

Uniwersytet Marii Curie-Skłodowskiej (Polska)
Maria Curie-Sklodowska University (Poland)

e-mail: siergiej.kowalow@poczta.umcs.lublin.pl

Маніхвэст… (1987) як літаратурна-грамадская праграма Таварыства маладых літаратараў „Тутэйшыя"

"Manifest…" (1987) as a Literary and Social Program of the Association of Young Writers "Tuteyshyya" ("Locals")

„Manifest…" (1987) jako program literacki i społeczny Stowarzyszenia Młodych Literatów „Tutejsi"

20 снежня 2016 г. споўнілася трыццаць гадоў з дня ўтварэння суполкі „Тутэйшыя", якая пакінула яскравы след у гісторыі беларускай літаратуры.

> Узнікненню і развіццю Новай літаратурнай сітуацыі нацыянальнае пісьменства ў многім абавязана творчай дзейнасці ўдзельнікаў літаратурнага таварыства „Тутэйшыя" <…> Дзейнасць „Тутэйшых" паўплывала на развіццё такіх з'яў, як *дэіерархізацыя пісьменніцкіх арганізацый, дэідэалагізацыя мастацкіх і літаратурна-крытычных тэкстаў, змястоўная і жанравая дыверсіфікацыя, стварэнне мастацкай канцэпцыі пакалення* (2015, s. 323),

– адзначае ў сваёй найноўшай манаграфіі Ганна Кісліцына.

Пра грамадскі і эстэтычны феномен „Тутэйшых" пісалі такія вядомыя аўтары як Арнольд Макмілін, Ян Максымюк, Алесь Аркуш, Валянцін Акудовіч, Ганна Кісліцына, Ігар Жук. Аксана Бязлепкіна нават прысвяціла суполцы асобную манаграфію *Разам і паасобку: таварыства "Тутэйшыя". Гісторыя. Асобы. Жанры* (Мінск 2003). Нягледзячы на з'яўленне цэлага шэрагу цікавых публікацый, многія аспекты дзейнасці і мастацкай творчасці „Тутэйшых" разгледжаны недастаткова падрабязна і глыбока, заахвочваюць да правядзення больш дэталёвага аналізу і стварэння новых інтэрпрэтацый.

Адным з такіх аспектаў з'яўляецца літаратурна-грамадская праграма „Тутэйшых", выкладзеная ў неапублікаваным *Маніхвэсце Тутэйшых* (1987). Задума напісання асобнага артыкула на гэтую тэму ўзнікла падчас чытання цытаванай вышэй манаграфіі Ганны Кісліцынай *Культурны градыент. Ідэі, маніфесты,*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX-XXI стагоддзяў (Мінск 2015). Аказалася, што ў гэтай змястоўнай манаграфіі *Маніхвэст…* цытуецца паводле манаграфіі Аксаны Бязлепкінай: г.зн., што непрацытаваных папярэдніцай пунктаў праграмы суполкі даследчыца на ўласныя вочы не бачыла.

Manichwest Tutejszych з'яўляецца самым важным праграмным дакументам суполкі, хаця гэты дакумент ніколі не публікаваўся па-беларуску: толькі ў 1997 г. у Польшчы быў надрукаваны польскі пераклад Мікалая Ваўжэнюка (Manifest „Tutejszych", 1997, s. 12–13). *Маніхвэст…* быў напісаны ў Гомелі Сяргеем Дубаўцом па просьбе Алеся Бяляцкага і Анатоля Сыса і агучаны апошнім на адным з пасяджэнняў „Тутэйшых" у Доме Літаратара ў Мінску вясной 1987 года як праект калектыўнай літаратурна-грамадскай праграмы суполкі. Трэба адзначыць, што большасць прысутных на тым пасяджэнні тутэйшаўцаў не ведала, кім быў напісаны праект, а большасць адсутных так і не пазнаёміліся пазней з гэтым дакументам. Праект выклікаў бурлівую дыскусію і ў выніку галасавання было вырашана адкласці яго на дапрацоўку, каб ён не пярэчыў статусу суполкі як Таварыства маладых літаратараў пры СП Беларусі і яго можна было апублікаваць разам з мастацкімі творамі ў альманаху *Тутэйшыя*.

Маніхвэст… уяўляў сабой чатыры старонкі машынапіснага тэксту тарашкевіцай і быў падзелены на чатыры часткі і 33 пункты. Падзел на часткі выглядаў досыць умоўным. Першая частка (пп. 1–9) пачыналася з нацыянал-адраджэнскага лозунга „Літаратура – гэта Бацькаўшчына" (*Manichwest Tutejszych*, 1987, s. 1)[1] і абвяшчэння Ўладзіміра Караткевіча прарокам, а наступныя сем пунктаў змяшчалі абвінавачанні беларускіх савецкіх пісьменнікаў, якія здрадзілі беларускаму народу і сталіся „прыкарытнымі" пры ўладзе.

„Прагледзеўшы як сканала мова ў вуснах народу, пагубляўшы ўсе нацыянальныя школы, не падрыхтаваўшы жыццяздольнае зьмены, аблуднае „пакаленьне„ сыходзіць у нябыт. Па ім – мора запыленых кніжак і поўная дыскрэдытацыя ўсяго свайго, усяго адметна-беларускага, усяго сьвятога, што ёсьць на нашай зямлі" (с. 1).

У другой частцы (пп. 10–17) пералічваліся канкрэтныя грамадскія задачы, якія ставілі перад сабой *Тутэйшыя*: дбаць пра нацыянальную школу, адраджаць родную мову шляхам яе паўсядзённага ўжытку, вывучаць і папулярызаваць нацыянальную гісторыю.

„Нашая гісторыя – вялікая, багатая, невядомая. Гэта мая школа, якое я не прайшоў. Гэта мае самыя галоўныя ўрокі, якіх я не меў. *Магчыма, прыкарытныя найграна сьмяюцца, „разьвітваючыся са сваёй мінуўшчынай"*[2], я ж кіруюся запаветам прарока: „Абыякавы да мінулага ня мае аніякай інтэлектуальнай пера-

[1] Тут і далей *Маніхвэст Тутэйшых* цытуецца паводле машынапіснага экзэмпляру з майго асабістага архіву, у дужках пазначаецца старонка. На гэтым экзэмпляры захаваліся праўкі, нанесеныя рукою Анатоля Сыса.

[2] У экзэмпляры з майго архіву фрагмент, пазначаны курсівам, выкрэслены.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

вагі над жывёлай і таму ёсць першы кандыдат на маральную, а затым і фізічную сьмерць. Усё адно, хто гэта – чалавек ці народ!" (с. 3)

Трэцяя частка (пп. 18–21) называлася *Рэанімацыя слова*[3] і развівала ідэі папярэдняй, канкрэтызуючы моўную стратэгію „Тутэйшых": адмаўленне рэформы 33–га года, вяртанне мяккіх знакаў і пераднаціскнога „я" ў прыназоўніках, адмаўленне нарматыўных акадэмічных слоўнікаў, вывучэнне мовы па творах Францішака Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Караткевіча, пошук патрэбных слоў у дыялектах і гістарычнай літаратуры.

Чацвёртая частка (пп. 22–33) мела загаловак *Творчасьць* і датычыла непасрэдна літаратуры. Нягледзячы на вялікую колькасць пунктаў, гэтая частка была самай эклектычнай і непераканаўчай[4]. Слушна ставілася задача не паўтараць гатовыя ўзоры, развіваць розныя жанры і стылі („амплуа"), мабільныя формы прозы (кароткі раман, кароткі гістарычны раман), дбаць пра інтэлектуалізм твора, не паўтараць, на беларускай глебе ўсе тыя вышыні, якія прайшла сусветная літаратура (гэта задача перакладчыкаў), а ісці далей. Але ў асобных пастулатах выяўляўся ідэалізм і наіўны максімалізм: „Кожны мой твор мусіць быць дзівам. Або літаратура абсалютна адметная і непрадказальная – або нелітаратура наогул" (с. 4). Асабліва цьмянымі былі пункты, прысвечаныя паэзіі, напрыклад, 31–шы:

> Я вымяраю паэзію музыкай. Дзьве гэтыя галінкі спрадвеку ішлі побач: то аддаляліся ў горшыя для паэзіі часы, то набліжаліся ў часы паэтычнага росквіту. У наяўнай „беларускай літаратуры" няма твораў-спадарожнікаў сучаснае музыкі. Хіба толькі творы прарока, творы Разанава… (с. 4)[5].

Некалькі важных для літаратурнай творчасці дэкларацый змешчана ў папярэдніх частках маніфеста. Напрыклад, пра барацьбу з засіллем вясковай тэматыкі ў беларускай літаратуры і неабходнасць развіваць урбаністычную культуру:

> „Нацыянальнай спецыфікай" прыкарытных з'яўляецца ілжэвяскоўшчына. Жывучы ў горадзе, яны натужна і назольна сьпекулююць на сваім вясковым паходжанні <…> Я – месціч. Я не камплексую наконт сучаснай масавай гарадской культуры. Я падключаны да яе (с. 2).

Сапраўды, пакаленне „Тутэйшых" стала першым пакаленнем беларускіх пісьменнікаў, у якім колькасць народжаных у горадзе аўтараў не саступала колькасці народжаных у вёсцы, а тыя, хто нарадзіўся ў вёсцы не ўспрымалі гарадскую

[3] У экзэмпляры з майго архіву папраўлена на: *Ажыўленне слова*.

[4] Сімптаматычна, што ў манаграфіях А. Бязлепкінай і Г. Кісліцынай найменш увагі прысвечана гэтай частцы *Маніхвэсту*…

[5] У экзэмпляры з майго архіву папраўлена: „Купала, Караткевіч, Разанаў, Сыс".

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

культуру як чужую і не ідэалізавалі ў сваіх творах вясковую мараль і гарманічнае жыццё на ўлонні прыроды.

І ўсё ж такі грамадскі, нацыянал-адраджэнскі кампанент у *Маніхвэсце Тутэйшых* выразна дамінаваў над эстэтычным, літаратурна-мастацкім. Чырвонай ніткай праз усе чатыры часткі маніфесту праходзілі паняцці „Бацькаўшчына", „народ", "мова", "гісторыя". Фактычна, у *Маніхвэсце*... была выкладзена праграма цэлага пакалення маладых зрусіфікаваных беларусаў, якія не ведалі ўласнай мовы і гісторыі, адчулі сябе беларусамі, дзякуючы творам Караткевіча, і цяпер самастойна вывучалі мову, адкрывалі для сябе рэпрэсаваных у 30-я гг. пісьменнікаў, спрабавалі адрадзіць беларускія народныя абрады і гістарычную памяць нацыі. Пад асноўнымі пунктамі *Маніхвэсту* маглі б падпісацца не толькі маладыя літаратары, але і маладыя мастакі, тэатралы, журналісты, навукоўцы, проста патрыёты Бацькаўшчыны. У гэтым сэнсе грамадская праграма Тутэйшых супадала з праграмамі іншых нефармальных культурна-адраджэнскіх суполак 80-х гг. „Майстроўні", „Талакі", „Світанку", „Касінера". У вобразе "прыкарытных" маглі пазнаць сябе не толькі старэйшыя пісьменнікі, але і прадстаўнікі іншых творчых саюзаў, якія „вешаюць на сябе ўзнагароды і ганаровыя біркі „народных", „лаўрэатаў", "заслужаных" хоць заслужылі адно ганьбы свайго народа" (с. 1), а таксама акадэмікі-навукоўцы – "кучка падсьлепаватых сьпяцоў", якія прыўлашчылі сабе мову і гісторыю (с. 3).

Аналізуючы *Маніхвэст Тутэйшых*, даследчыкі слушна адзначалі яго ідэйную і стылёвую блізкасць да славутага эсэ Ігната Абдзіраловіча (Канчэўскага) *Адвечным шляхам*... (Biazlepkina, 2003, s. 17), падкрэслівалі, што *Маніхвэст*… „акцэнтаваў *неабходнасць нацыянальнага як крытэрыю спелай літаратуры…"* (Kislicyna, 2015, s. 83*)*, „мусіў падтрымліваць дух сапраўднага літаратара-патрыёта і быў досыць рамантычным" (Biazlepkina, 2003, s. 22).

Дамінацыю ў *Маніхвэсце Тутэйшых* нацыянал-адраджэнскага, патрыятычнага кампаненту над эстэтычным нельга разглядаць як свядомую перавагу грамадска-палітычнай дзейнасці над літаратурнай творчасцю ў жыцці суполкі. Проста агульную *грамадскую* пазіцыю лягчэй было сфармуляваць, чым *эстэтычную*. У суполку ўваходзіла больш паўсотні аўтараў, усіх іх аб'ядноўвала непрыманне камуністычнай ідэалогіі і імперскай палітыкі русіфікацыі, любоў да Бацькаўшчыны і вера ў нацыянал-адраджэнскія ідэалы. Аднак гэтыя аўтары мелі розныя творчыя крэда, адметныя мастацкія манеры і індывідуальныя стылі (прынамсі, у зародку). Вельмі цяжка (а, можа, і ўвогуле немагчыма) было знайсці для ўсіх іх агульныя творчыя арыенціры, вызначыць агульную эстэтычную платформу.

Напрыклад, *Маніхвэст* заклікаў змагацца з празмернай пафаснасцю і праявамі высокага стылю ў літаратуры: „Беларусь, Бацькаўшчына, Радзіма, Айчына, народ, маці, любоў, душа, сэрца, боль, мір, барацьба… Прыкарытны выводзіць гэтыя словы ў мільённы раз, мокрай анучай па школьнай дошцы: ня піша – сьцірае. Я накладаю на гэтыя словы забарону. Толькі ў самай апошняй, вы-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

ключнай патрэбе, калі буду сьвята перакананы, што не сьцяру, але ацалю такое слова, я наважуся ўжыць яго. Я адмаўляюся ад усялякай высокай „фразеалогіі"" (с. 3) У процівагу пафаснасці і лозунгавасці прапаноўвалася ўжыванне „… таго, чаго няма ў прыкарытных – іроніі, горкай іроніі, самаіроніі. Яны наогул не іранізуюць, бо ў іроніі немагчыма схлусіць. Іронія не старэе, яна – просты шлях да трагічнага. Мой гумар – сарказм" (с. 4)

Сапраўды, калі чытаеш прозу альбо эсэістыку Сяргея Дубаўца, там не знойдзеш ўзнёслай рамантычнай патэтыкі і праяваў "высокага стылю", затое ўсе яго-ныя тэксты насычаны з'едлівай аўтарскай іроніяй і нават сарказмам.

Але ці можна ўявіць без ужывання слоў „Беларусь", „Радзіма", "Бацькаўшчына", „Айчына", „народ", „маці", „душа", „сэрца" паэзію Анатоля Сыса?

– З чаго пачаць?
Пачну з Радзімы.
Так абавязаны пачаць.
– Але ў яе ты не адзіны,
навошта ж пра любоў крычаць?

– Няхай, няхай я паўтаруся
ў любові тысячу разоў,
затое шчыра ў ёй клянуся,
без фальшу, без падробных слоў,

– пачынаецца зборнік Анатоля Сыса *Агмень (*1988, s. 5).

Уладзімір Караткевіч і Алесь Разанаў як пісьменнікі і грамадзяне карысталіся вялікім аўтарытэтэм ва ўсіх тутэйшаўцаў, але не ўсе пагаджаліся з палажэннямі *Маніхвэсту* пра тое, што ў Караткевіча трэба вучыцца беларускай мове, а вершы Разанава з'яўляюцца эталонам „твораў-спадарожнікаў сучаснае музыкі".

Не ўсе сябры суполкі гатовыя былі перайсці на тарашкевіцу, некаторыя лічылі дастатковым ужыванне мяккіх знакаў, а іншыя ўважалі разумным трымацца наркамаўкі, пакуль на тарашкевіцу не пяройдуць школы і ўніверсітэты.

Але не эстэтычныя і моўныя пункты выклікалі найбольшую нязгоду пры абмеркаванні *Маніхвэсту* на паседжанні Таварыства. Нязгоду ў *Маніхвэсце* выклікала свядомая правакацыя старэйшых калегаў, сяброў Саюза пісьменнікаў Беларусі, якія агулам абвяшчаліся "прыкарытнымі" і на якіх ускладалася галоўная віна за трагічны стан беларускай мовы і культуры ў краіне.

Вобраз статку "прыкарытных" пісьменнікаў, якія дзеля матэрыяльнай карысці прадалі свой народ і нацыянальныя ідэалы, стаўся найбольш яскравым і запамінальным мастацкім вобразам *Маніхвэсту* і хутка адасобіўся ад тэксту, стаў папулярным сярод тутэйшаўцаў і пайшоў "у народ". Гэты саркастычны вобраз адлюстроўваў рэальны дысананс паміж прыніжаным становішчам нацыянальнай культуры ў зрусіфікаванай Савецкай Беларусі і высокім сацыяльным

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

статусам і матэрыяльным дабрабытам беларускага пісьменніка, носьбіта гэтай культуры.

Створаны ў *Маніхвэсце* вобраз "прыкарытных" быў блізкі да цэлай галерэі здраднікаў Радзімы (матылёў, пацукоў, свіней і інш.) з вядомай нізкі тутэйшаўца Алега Minkina *Наследаванні Дантэ:*

Ты бачыш палахліўцаў тых,
Што ведалі Радзімы лёс гаротны,
Пакутвалі і спачувалі ўпотай –
Ды ў норах трэсліся, стаіўшы дых.

Тут, змушаны Радзіму кataваць,
Ураз празрэў калісьці невідушчы,
Што ганьба абрастаць у норах тлушчам,
Калі патрэбна бачыць, чуць, крычаць!" (Minkin, 1985, s. 38).

Меўся ў вышэйзгаданай нізцы Мінкіна і верш *Сьвіньні,* які па цэнзурных прычынах не ўвайшоў у зборнік *Сурма*, але распаўсюджваўся ў рукапісах і быў вядомы многім тутэйшаўцам:

І выйшаў я да ўкопанага ў гной
Вялізнага сьмярдзючага карыта,
Зь якога людзі-сьвіньні жэрлі спрытна,
Штурхаючыся зь віскам між сабой.

І ўбачыў я ў памыях стосы кніг,
І ў сьвіньнях аўтараў пазнаў шматлікіх,
І скалануўся, і ў зьдзіўленьні ўсклікнуў:
"Хто і за што так зьдзекуецца зь іх?"

Пачуў: "Перад табой натоўп пісак,
Якія крыўду абвясьцілі праўдай
І, мову прадзедаў схаваўшы ў спраты,
Піхалі, што ні трапіць, у вальляк.

Яны адзіны клопат мелі там:
Як ухапіць што-болей зяпай ласай,
І тут, як бачыш, стосы кніг уласных
Цяпер глынаюць з гноем напалам!" (Minkin, 1991, s. 14)

Але адна справа – алегарычны вобраз у паэтычным творы, іншая справа – праграмны маніфест Таварыства, якое збіралася на сходы ў Доме літаратара і прэтэндавала на статус маладзёжнай секцыі пры Саюзе пісьменнікаў. З асноў-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

нымі ідэямі *Маніхвэсту* тутэйшаўцы былі згодныя і старэйшых калег-пісьменнікаў у сваіх выступленнях пастаянна крытыкавалі, але рэзкі стыль *Маніхвэсту* выклікаў нязгоду:

„Над карытам літаратуры стаў відаць заклік: „Жарэце, абы не ўсчынялі віску!" (с. 1).

„Толькі сыта адрыгваючы[6], яны вешаюць на сябе ўзнагароды і ганаровыя біркі[7]…" (с. 1).

„Мы не наступнікі прыкарытных. Таму хай яны ўзьненавідзяць нас, так як ненавідзілі ў пророку сябе"[8] (с. 1).

Многія з сяброў Саюза пісьменнікаў Беларусі падтрымлівалі „Тутэйшых", напрыклад, Вольга Іпатава, Раіса Баравікова, Яўгенія Янішчыц, Хрысціна Лялько. Мы не разумелі, навошта было абражаць гэтых сімпатычных жанчын і таленавітых пісьменніц. З прыхільнасцю ставіліся да дзейнасці Тутэйшых, выкладчыкі БДУ, якія былі членамі СП: Алег Лойка, Дзмітры Бугаёў, Вячаслаў Рагойша. Будучы на той час аспірантам кафедры беларускай літаратуры БДУ, я не ўяўляў сабе адносіны са старэйшымі калегамі ў стылі *Маніхвэсту*… А некаторыя з тутэйшаўцаў ўвогуле паходзілі з пісьменніцкіх сем'яў: браты Адамчыкі (Адам Глобус і Міраслаў Шайбак), Максім Клімковіч, Лявон Вольскі. Як ім было глядзець у вочы сваіх бацькоў, падпісаўшыся пад *Маніхвэстам Тутэйшых?*

Недаўменне ў большасці тутэйшаўцаў выклікала прапанова *Маніхвэсту*… адмовіцца ад публікацыі твораў у афіцыйных часопісах і дзяржаўных выдавецтвах і заняцца літаратурнай партызаншчынай:

> Я пішу для людзей, а не для цэнзуры і рэдактараў, не дзеля вузкага прыкарытнага кола. Я пішу не дзеля публікацыі ў рэтраградных часопісах і выдавецтвах, дзе самастойная думка лічыцца або памылкай, або палітычным злачынствам. Я пішу ў самаробныя альманахі, начытваю на магніта- і відэамагнітафоны, я чытаю ў кожным мейсцы, дзе збіраецца народ (с. 2).

Творчыя лідэры „Тутэйшых" – Анатоль Сыс, Адам Глобус – чакалі выхаду сваіх кніг у выдавецтве „Мастацкая літаратура", рыхтавалі да выдання зборнікі многія іншыя сябры суполкі: Алег Мінкін, Сяржук Сокалаў-Воюш, Уладзімір Сцяпан, Максім Клімковіч, Алесь Наварыч, на старонках газеты „Літаратура і мастацтва" і часопіса „Маладосць" публікаваліся крытычныя артыкулы Сяргея Дубаўца, Алеся Бяляцкага, Пятро Васючэнкі, у выдавецтве „Мастацкая літаратура" рыхтаваўся да выдання калектыўны альманах „Тутэйшыя", які паводле першапачатковай задумы мусіў адкрывацца якраз *Маніхвэстам*… Набірала сілу абвешчаная Гарбачовым палітыка *перабудовы, дэмакратызацыі і галоснасці,* і ў той час мы спадзяваліся

[6] У экзэмпляры з майго архіву папраўлена на: „Сытыя і задаволеныя".
[7] У экзэмпляры з майго архіву папраўлена на: „назовы".
[8] У экзэмпляры з майго архіву папраўлена: „як ненавідзілі Прарока".

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

на рэфармаванне "рэтраградных часопісаў і выдавецтваў", ператварэнне іх у сучасныя, адкрытыя для маладых аўтараў і цікавыя для чытачоў выданні, а не на падпольнае распаўсюджанне сваіх твораў шляхам самвыдату.

Згодныя з асноўным зместам *Маніхвэсту…*, з яго нацыянальна-адраджэнскім пафасам і крытычнай ацэнкай стану тагачаснай беларускай літаратуры, прысутныя на абмеркаванні праекту тутэйшаўцы былі катэгарычна супраць асобных яго пунктаў і правакацыйнага стылю, які спрыяў канфрантацыі са старэйшымі пісьменнікамі і нагнятанню варожай атмасферы вакол Таварыства. У выніку адкрытага галасавання *Маніхвэст…* не зацвердзілі, а адклалі на дапрацоўку. Спачатку здавалася, што такая дапрацоўка – цалкам магчымая і патрэбная, што дастаткова змяніць стыль, выкінуць некалькі дыскусійных пунктаў, а некалькі іншых пунктаў дадаць, і *Маніхвэст…* можна будзе прыняць у якасці калектыўнай літаратурна-грамадскай праграмы суполкі і апублікаваць.

Менавіта з мэтай перапрацоўкі экзэмпляр *Маніхвэсту…* апынуўся ў мяне і я сумленна спрабаваў гэтую працу зрабіць, пра што згадваў пазней у анкеце для Аксаны Бязлепкінай (2003, s. 17–18). У маім асабістым архіве захаваўся тэкст з 1987 г., які з'яўляецца вынікам гэтых намаганняў і адлюстроўвае як сугучча, так і розніцу ў поглядах асобных сяброў „Тутэйшых". Тэкст ўяўляе сабой тры старонкі машынапісу наркамаўкай (але з мяккімі знакамі), складаецца з дванаццаці пунктаў і двух заўваг. У дзесяці пунктах пераказваюцца асноўныя ідэі *Маніхвэсту…* С. Дубаўца, але ў менш экспрэсіўнай форме і без заклікаў да канфрантацыі са старэйшымі пісьменнікамі. Выглядаў гэты пераказ наступным чынам:

> Задача нашага таварыства – аб'яднаць маладых літаратараў, якія ўсьвядомілі адказнасьць свайго пакаленьня за далейшы лёс беларускай літаратуры: перад папярэднікамі, якія шмат для яе зрабілі, перад наступнікамі, якія пойдуць далей за нас, перад народам, для якога гэтая літаратура ствараецца. <…>
>
> Я разумею, што лёс літаратуры непарыўна зьвязаны з лёсам бацькаўшчыны, таму клопат пра бацькаўшчыну для мяне – клопат пра літаратуру. <…>
>
> Я імкнуся да высокага тэхнічнага ўзроўню маіх твораў, без якога немагчыма сёньня выяўленьне глыбокага ідэйнага зьместу. Я адмаўляюся ад паўсядзённай „ілжэвяскоўшчыны" як „псэўданацыянальнай" спэцыфікі. Вёска адна ў неабсяжным коле тэмаў. Я разумею значэньне разьвіцця ўрбаністычных матываў у літаратуры (Litaraturnyja pamknienni „Tawarystwa maładych litaratarau pry SP BSSR", 1987, s. 1–3) і г.д.

Два пункты, якія падаліся мне істотнымі – пра крытыку і традыцыі – я дадаў ад сябе:

> Я імкнуся талерантна ставіцца да творчых пошукаў іншых. Адзінае агульнае патрабаваньне – сумленныя адносіны да літаратуры. Адзіны крытэрый – высокі ідэйна-мастацкі ўзровень. Я вучуся слушна ўспрымаць і разумець крытыку. […]

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

> Я не атаясамліваю цалкам традыцыі духоўныя, якія бліжэй да грамадска-палітычных ідэй і традыцыі мастацкія, якія бліжэй да паняццяў „школа", „манера", „стыль", не блытаю іх, не падмяняю адно адным. Калі духоўныя традыцыі Янкі Купалы, напрыклад, абавязкова наследуюцца кожным з нас, наследаваньне яго мастацкіх традыцый зусім не абавязковае для пасьлядоўніка іншага напрамку, іншай школы (Litaraturnyja pamknienni „Tawarystwa maładych litaratarau pry SP BSSR", 1987, s. 3).

Заканчваўся тэкст *Заўвагамі*, якія вытлумачвалі яго генэзіс і прызначэнне:

> *Літаратурныя памкненьні* створаныя з мэтаю папярэдняга аб'яднаньня маладых беларускіх літаратараў на падставе некаторых агульных поглядаў і задач. Погляды і задачы гэтыя ні ў якім разе *Літаратурнымі памкненьнямі* не абмяжоўваюцца. Іх далейшы працяг – у літаратурна-крытычных артыкулах удзельнікаў таварыства, пацьверджанне і абгрунтаваньне – у мастацкай практыцы.
> Усе дапаўненьні і заўвагі пішуцца ўдзельнікамі таварыства на наступных чыстых старонках у выглядзе пакуль што прыватных думак, з подпісам прозьвішча і імя" (Litaraturnyja pamknienni „Tawarystwa maładych litaratarau pry SP BSSR", 1987, s. 3).

Такім чынам, меркавалася, што кожны з сяброў суполкі зможа дапісаць свае прапановы і ў выніку калектыўнага абмеркавання будзе зацверджана афіцыйная літаратурна-грамадская праграма „Тутэйшых", якая потым будзе апублікавана ў альманаху Таварыства.

Не ведаю, ці такая літаратурна-грамадская праграма, якая б задавальняла ўсіх сяброў суполкі ўвогуле была мажлівая. Але, прачытаўшы свой праект яшчэ раз, я моцна засумняваўся ў патрэбнасці такога кампраміснага, „лагоднага" варыянту Праграммы суполкі. У *Маніхвэсце*… С. Дубаўца былі перабольшанні і правакацыйныя пункты, але прысутнічала моцная энэргетыка, яскравая мастацкая форма. У *Літаратурных памкненьнях* былі толькі думкі, якія маглі быць выказаныя ў звычайных літаратурна-крытычных артыкулах, на старонках афіцыйных газет і часопісаў. Я паказаў свой праект Адаму Глобусу, які таксама не прымаў многія пункты *Маніхвэсту*…, і ён пацвердзіў мае сумненні: кампрамісны варыянт Праграмы быў крокам назад, ідэя перапрацоўкі *Маніхвэсту*… аказалася памылковай.

У дзейнасці „Тутэйшых" мне падабалася тое, што памылковыя ідэі аднаго з сяброў выпраўляліся іншымі, аптымізм Бяляцкага згладжваў скептыцызм Дубаўца, рацыяналізм Глобуса ўраўнаважваў стыхійнасць Сыса і г.д., а ўсе найважнейшыя рашэнні прымаліся калектыўна. Параіўшыся на чарговым пасяджэнні, мы вырашылі не зацвярджаць *Маніхвэст*… у якасці афіцыйнай літаратурна-грамадскай праграмы Таварыства, не імкнуцца апублікаваць яго, згладзіўшы „вострыя вуглы", а пакінуць у першапачатковым выглядзе як таемны, "падпольны" дакумент, з якім мог пазнаёміцца кожны з сяброў суполкі, але ніхто з чужынцаў. Неўзабаве *Маніхвэст*… аброс чуткамі і легендамі, як і сама суполка „Тутэйшых", а потым увогуле ператварыўся ў міф.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

Хаця *Маніхвэст…* меў свайго канкрэтнага аўтара, яго значэнне і сіла заключаліся ў тым, што ў гэтым невялічкім тэксце былі выказаныя ідэі і патрабаванні ўсёй суполкі „Тутэйшых", усяго пакалення маладых пісьменнікаў 80-хх гг. XX ст. На калектыўны характар *Маніхвэсту Тутэйшых* слушна звярталі ўвагу даследчыкі.

> Можна сказаць, што „Маніфест" – гэта своеасаблівае падагульненне думак, меркаванняў, спрэчак, якімі жылі „Тутэйшыя". „Маніфест" не быў абнародаваны перад усімі сябрамі таварыства, але пра яго існаванне было вядома. І міфічны „Маніфест" пачаў жыць самастойным жыццём, незалежным ад „Маніфеста" сапраўднага (2003, с. 18),

– піша А. Бязлепкіна.

А. Г. Кісліцына адзначае: „І якім бы наіўным ні здаваўся некаторым зараз дубаўцоўскі „Маніфест", ён быў вынікам калектыўнага роздуму над лёсам беларускай літаратуры: спробай пазбегнуць памылак папярэднікаў і выкрышталізаваць уласныя творчыя прынцы" (2015, с. 82)

Свае літаратурна-грамадскія погляды „Тутэйшыя" выказалі таксама ў шэрагу калектыўных анкет і інтэрв'ю, апублікаваных у афіцыйным беларускім друку ў 1988–1989 гг. (*Usio napieradzie: Ankieta „Maładosci"*, 1988, s. 143–156; *„Nieformały" – kto wy?*", 1988, s. 159–168; *Chto wy, „Tutejszyja"*, 1989, s. 2–3, 22–23). Гэтыя выступленні перагукаюцца з многімі пунктамі неапублікаванага *Маніхвэсту…* і пацвярджаюць важнасць выказаных там ідэй для дзейнасці і творчасці сяброў суполкі.

Так, у адказе А. Бяляцкага на анкету часопіса „Маладосць" чытаем:

> У „Тутэйшыя" ўваходзяць людзі з рознымі мастацка-эстэтычнымі поглядамі на літаратуру, на жыццё. Але можна вызначыць агульныя рысы, што аб'ядноўваюць нас. Літаратура – гэта Бацькаўшчына. Рэалізацыя гэтай ідэі ў творчасці ідзе з аднаго боку праз імкненне да мастацкай праўдзівасці ў адлюстраванні рэчаіснасці, з другога – праз удасканаленне, мадэрнізацыю формы. Ісціна ж недзе пасярэдзіне. Нецярпімыя адносіны ў Таварыстве да спажывецтва ў літаратуры, калі пішуць „дзеля кавалка хлеба", не думаючы асабліва, пра што і як. „Прыкарытніцтва" – адна з прычын зніжэння аўтарытэту нашай літаратуры (*Usio napieradzie: Ankieta „Maładosci"*, 1988, s. 143–145).

У адказе Язэпа Янушкевіча на гэтую ж анкету таксама гучыць крытыка „прыкарытніцтва":

> Нашая ж эпоха, асабліва тыя дзесяцігоддзі, якія цяпер называюць „застойнымі", дазволіла развівацца ў невядомых раней для беларускай літаратуры памерах прыстасавальніцтву, падхалімажу, пратэктарству, запалоханасці аўтара „ўнутраным" і "знешнім" рэдактарам, каб не апынуцца ў непажаданых „кліматычных умовах" (геаграфічна і палітычна) спарадзілі сумна вядомае „На мой век і сямейны хлеб

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

> беларускай мовы хопіць". Тым самым пачаўся працэс раскрадання, падмену духоўных скарбаў нацыі, скарбаў, якія на працягу нялёгкіх стагоддзяў назапашвалі папярэднікі (*Usio napieradzie: Ankieta „Maładosci"*, 1988, s. 153).

Праблема канфлікту пакаленняў асэнсоўваецца і ў маім адказе на апытанне часопіса „Нёман":

> Мне кажется, что этот конфликт глубже, чем просто конфликт поколений. Многие писатели негативно относятся к „Тутэйшым" из-за того, мол, что мы их не признаем. И это правда – некоторых не признаем. Есть за что. Ведь в том, что у нас мизерные тиражи, а книги простаивают в магазинах по пять-десять лет – есть заслуга тех писателей, которые своим „творчеством" и гражданской пассивностью только дискредитируют родную речь, культуру, национальную самобытность и думают только о деньгах и званиях. Выходит, что у нас с ними совершенно разные, противоположные задачи. В этом конфликт (*„Nieformały" – kto wy?"*, 1988, s. 162).

Можна ўважліва прааналізаваць усе афіцыйныя выступленні тутэйшаўцаў у друку на прадмет адпаведнасці іх выказванняў канкрэтным пунктам *Маніхвэсту*…[9] Але нават у трох выбраных мной цытатах гэтае падабенства выразна відаць. Што цікава, „крамольныя думкі", выказаныя не ў самвыдатаўскіх альманахах, у якіх заклікаў друкавацца аўтар *Маніхвэсту*… ў 1987 г., а на старонках тых самых рэтраградных часопісаў, дзе, калі верыць *Маніхвэсту*… „самастойная думка лічыцца або памылкай, або палітычным злачынствам" (с. 2). Больш таго, у 1988 г. сам Сяргей Дубавец працаваў у адным з такіх часопісаў, „Нёмане", і разам з Алай Сямёнавай арганізаваў круглы стол пад назвай *„Неформалы" – кто вы?* і задаваў мне пытанне пра ўзаемаадносіны Саюза пісьменнікаў і „Тутэйшых"… Такім чынам, час унёс карэктывы ў літаратурна-мастацкую праграму „Тутэйшых", якія паспяхова спалучалі грамадска-палітычную і літаратурную дзейнасць, публікацыю сваіх твораў у самвыдатаўскіх і афіцыйных выданнях.

З нагоды трыццацігоддзя заснавання Таварыства маладых літаратараў „Тутэйшыя" варта было б выдаць зборнік дакументальных матэрыялаў пра дзейнасць суполкі, куды ўвайшлі б архіўныя матэрыялы, інтэрв'ю сяброў таварыства, водгукі ў друку. Сваё пачэснае месца сярод гэтых дакументаў заняў бы і легендарны *Маніхвэст Тутэйшых,* які ў яскравай і лаканічнай форме найбольш поўна выявіў літаратурна-грамадскую праграму суполкі.

[9] Гэтай тэме я мяркую прысвяціць асобны артыкул.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

Bibliografia

Źródła

Litaraturnyja pamknienni „Tawarystwa maładych litaratarau pry SP BSSR”. (1987). Maszynapis. Asabisty archiu Siarhieja Kawalowa.

Manichwest Tutejszych. (1987). Maszynapis. Asabisty archiu Siarhieja Kawalowa.

Manifest „Tutejszych”. Tłum. M. Wawrzeniuk. (1997). *Kartki,* 1, s. 12–13.

Minkin*,* Aleh. *Raskolina*. (1991). *Wierszy i paema*. Minsk: Mastackaja litaratura.

Minkin*,* Aleh. (1985). *Surma*. Minsk: Mastackaja litaratura.

Sys, Anatol. (1988). *Ahmień*. Minsk: Biblijateczka czasopisa „Maładość”.

„Nieformały” – kto wy? (1988). *Nieman*, 6, s. 159–168.

Usio napieradzie: Ankieta „Maładosci”. (1988). *Maładość,* 4, s. 143–156.

Chto wy, „Tutejszyja”? (1989). *Biarozka,* 3, s. 2–3, 22–23.

Opracowania

Biazlepkina, Aksana. (2003). *Razam i paasobku: tawarystwa „Tutejszyja”. Historyja. Asoby. Żanry,* Minsk: Knihazbor.

Kawalou, Siarhiej. (2013). Preparawannie mifa. Tawarystwa „Tutejszyja” u lusterku krytyki, *Dziejasłou,* 2 (63), s. 307–320.

Kawalou, Siarhiej. (2007). Tawarystwa maładych litaratarau „Tutejszyja”: pierszyja uspaminy i artykuły. *Acta Albaruthenica,* 6, s. 170–180.

Kislicyna, Hanna. (2015). *Kulturny hradyjent. idei, manifiesty, kirunki biełaruskaj litaratury na miaży XX–XXI stahoddziau,* Minsk: Prawa i ekanomika.

Summary

The article deals with the literary and social program of the Association of Young Writers “Tuteyshyya” (“Locals", 1986–1989), which played an important role in the formation of the new Belarus literature and gave the name to a whole generation of writers. The program of the Association is set in a *Manihvestse Tuteyshyh* (*Manifest of the Locals*), written by Sergei Dubovtsev at the request of Ales Beliatski and Anatoly Sys. Analyzing the legendary text, the author of the article comes to the conclusion that the prevalence of social and political ideas of the aesthetic program “Tuteyshyh” and emphasizes the collective nature of the *Manifest…*, the main provisions of which are reflected in the individual speeches of the Association’s participants in the Belarusian press in 1987–1989.

Key words: Belarusian literature, the Association of Young Writers, "Tuteyshyya", genres palette, innovation

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 18:39:16

Streszczenie

W artykule rozpatruje się program społeczno-literacki Stowarzyszenia Młodych Literatów „Tutejsi" (1986–1989), które odegrało ważną rolę w tworzeniu nowej literatury białoruskiej oraz dało nazwę całemu pokoleniu pisarzy. Najbardziej wyraźnie i zwięźle program społeczno-literacki został przedstawiony w *Manifeście Tutejszych* napisanym przez Siarhieja Dubauca na prośbę Alesia Bielackiego i Anatola Sysa. Analizując legendarny tekst na podstawie egzemplarza z własnego archiwum, autor artykułu stwierdza przewagę postulatów społecznych i politycznych nad estetycznymi w programie „Tutejszych" i podkreśla zbiorowy charakter *Manifestu*…, którego podstawowe założenia znalazły odzwierciedlenie w indywidualnych wystąpieniach uczestników stowarzyszenia w białoruskiej prasie w latach 1987–1989.

Słowa kluczowe: literatura białoruska, Stowarzyszenie Młodych Literatów „Tutejsi", paleta gatunkowa, nowatorstwo

Рэзюме

У артыкуле разглядаецца літаратурна-грамадская праграма Таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя" (1986–1989), якое адыграла важную ролю ў станаўленні новай беларускай літаратуры і дало назву цэламу пісьменніцкаму пакаленню. Найбольш яскрава і лаканічна літаратурна-грамадская праграма суполкі выкладзена ў *Маніхвэсце Тутэйшых*, напісаным Сяргеем Дубаўцом па просьбе Алеся Бяляцкага і Анатоля Сыса. Аналізуючы легендарны тэкст паводле экзэмпляра з асабістага архіва, аўтар артыкула прыходзіць да высновы пра перавагу грамадска-палітычных ідэй над эстэтычнымі ў праграме "Тутэйшых" і падкрэслівае калектыўны характар *Маніхвэсту*..., асноўныя палажэнні якога знайшлі адлюстраванне ў індывідуальных выступленнях удзельнікаў суполкі ў беларускім друку ў 1987–1989 гг.

Ключавыя словы: беларуская літаратура, Таварыства маладых літаратараў „Тутэйшыя", жанравая палітра, наватарства